# На першы рэйс цягніка — больш чым 230 білетаў

**Беларуская чыгунка на першы рэйс цягніка № 2 Мінск — Масква рэалізавала 236 квіткоў. У адваротным кірунку на цягнік № 1 Масква — Мінск пасажыры набылі 229 квіткоў.**

Нагадаем, што 8 лютага ў 22.10 у першую паездку з Мінска ў Маскву выправіўся фірменны цягнік «Беларусь» № 2/1 Мінск — Масква.

У сталіцу Расійскай Федэрацыі ён прыбыў у 8.13 наступных сутак. У адваротным кірунку з Масквы цягнік адправіцца 9 лютага ў 22.13 і прыбудзе ў Мінск 10 лютага ў 7.26. Далей з Мінска ён будзе курсіраваць па цотных, а з Масквы па няцотных днях.

У прэс-цэнтры магістралі звярнулі ўвагу, што асобам, якія прыбываюць у Расійскую Федэрацыю з-за мяжы чыгуначным транспартам, неабходна прадставіць даведку пра абследаванне на COVID-19 з адмоўным вынікам лабараторнага абследавання метадам ПЛР, выдадзеную не пазней чым за тры дні да даты перасячэння Дзяржаўнай граніцы Расійскай Федэрацыі. Выключэнне складаюць дзеці ва ўзросце да пяці гадоў (пры наяўнасці даведкі ў суправаджаючых асоб), члены ўрадавых дэлегацый дзяржавы — члена ЕАЭС пры вяртанні ў краіну грамадзянства, члены лакаматыўных брыгад і асобы, звязаныя з перавозачнай дзейнасцю на чыгуначным транспарце.

Замежныя грамадзяне, якія дасягнулі шасцігадовага ўзросту, што прыбываюць на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь (выключэнне складаюць грамадзяне, якія маюць дазвол на пастаяннае або часовае пражыванне на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь), таксама павінны мець пры сабе арыгінал або копію медыцынскага дакумента на папяровым носьбіце ці ў электронным выглядзе, які пацвярджае адмоўны вынік лабараторнага даследавання на інфекцыю COVID-19, выкананага не пазней чым за трое сутак да даты перасячэння Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь.

Акрамя таго, пасажырам настойліва рэкамендавана выкарыстоўваць сродкі індывідуальнай ахова органаў дыхання.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**